4. Жарова, М.Н. Здоровье в системе жизненных ценностей человека // ГлавВрач, №9, 2012. – С. 57–63.

# ВЫКАРЫСТАННЕ СРОДКАЎ КРАЯЗНАЎСТВА НА ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАХ ЯК АСНОВА ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

***Н.С.Рамановіч***
***ДУА "Пінкавіцкая сярэдняя школа імя Якуба Коласа" Пінскага раёна***

Немагчыма ўявіць сабе культурнага і высокаадукаванага сучаснага чалавека, які б не ведаў гісторыі, звычаяў і абрадаў, мовы свайго народа. На жаль, у наш час часта сустракаешся з тым, што малады хлапец ці дзяўчына добра, нават дасканала, ведаюць некаторыя падзеі з гісторыі іншых краін, свабодна валодаюць замежнай мовай, а пра тую краіну, дзе жывуць самі, ведаюць вельмі мала, да крыўднага абыякава адносячыся да беларускіх звычаяў і роднай мовы.

Кепска быць глухому, яшчэ горш - сляпому і зусім дрэнна - бязроднаму. Той, хто не ведае гісторыі сваёй Радзімы, з'яўляецца глухім, сляпым і бязродным адначасова, і такога чалавека вельмі шкада, але яму можна дапамагчы.

У Беларусі 2018-2020 гады абвешчаны Годам малой радзімы. Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на ўрачыстай цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод лепшым работнікам аграрнай галіны рэспублікі. Прэзідэнт падкрэсліў, што прыйшоў час кожнаму не толькі ўзгадаць аб сваіх каранях, аб месцы, дзе засталася часцінка душы, але і аддаць доўг гэтаму кавалку зямлі. Кожны з нас павінен памятаць аб сваіх каранях і, дамогшыся чагосьці ў жыцці, аддаваць належнае малой радзіме.

Я лічу, што далучэнне ў вучэбны працэс матэрыялу краязнаўчага характару адкрывае новыя магчымасці для развіцця малодшых школьнікаў, фарміраванне ў іх агульнакультурных і агульначалавечых каштоўнасцей, патрыятычных адносін да свайго краю, садзейнічае развіццю пазнаваўчай цікавасці, больш свядомаму засваенню ведаў.

Вывучэнне краязнаўчага матэрыялу ў школе, асабліва ў пачатковых класах, садзейнічае выхаванню ў навучэнцаў гордасці за сваю малую радзіму і ўсю краіну наогул. Вывучэнне свайго краю як часткі вялікай Радзімы адпавядае прынцыпу "ад асобнага да агульнага". Краязнаўчы матэрыял даступны навучэнцам для засваення, дазваляе на канкрэтных прыкладах расказаць і нават паказаць дасягненні роднага краю, малой радзімы, усёй



Рэпазіторый БрДУ

краіны ў цэлым, раскрыць пераемнасць культурных традыцый і вызначыць месца роднага краю ў айчыннай і міравой культуры [1, с.31].

Настаўнік пачатковых класаў можа зацікавіць сваіх навучэнцаў гісторыяй роднага краю, абрадамі і звычаямі беларускага народа з маленства, асабліва гэта датычыцца дзяцей ва ўзросце 6 -10 гадоў. У гэтым узросце, безумоўна, нельга яшчэ гаварыць пра сістэмнае вывучэнне, напрыклад, гісторыі Беларусі, але можна (і нават неабходна) выклікаць у дзяцей пэўны эмацыянальны настрой пры знаёмстве з асобнымі з’явамі і падзеямі мінулага. Гэты добры настрой і зацікаўленасць гісторыяй свайго краю, абрадамі і звычаямі беларускага народа, мовай, на якой гаварылі нашы дзяды і прадзеды, з’явіцца тым падмуркам, які дазволіць набываць у далейшым усё больш змястоўныя веды.

На працягу навучання на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі настаўніку патрэбна знайсці адказы на пытанні: як развіваць цікавасць дзяцей да лёсу сваёй “малой Радзімы”? Як фарміраваць маральную пазіцыю ў адносінах да роднага краю?

У адпаведнасці з вышэйсказаным лічу, што тэма “Выкарыстанне сродкаў краязнаўства на факультатыўных занятках як аснова патрыятычнага выхавання на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі” з'яўляецца актуальнай.

“Краязнаўства вучыць людзей любіць не толькі свае родныя месцы, але і ведаць пра іх, прывучае іх цікавіцца гісторыяй, мастацтвам, літаратурай, павялічваць свой культурны ўзровень. Гэта - самы масавы пункт гледжання навукі.” Д.С. Ліхачоў. [2, с.23]

Вывучэнне краязнаўства ўплывае на духоўнае станаўленне чалавека, дапамагае выхаваць у дзяцей гонар за прыналежнасць да чалавечага роду, імкненне самому быць носьбітам агульначалавечых каштоўнасцяў, пераўтваральнікам і творцам свету.

Шырокія магчымасці адкрываюцца перад настаўнікам пры ўжыванні краязнаўчага падыходу. Вывучэнне роднага краю, яго гісторыі неабходна для ўсіх незалежна ад узросту. Але ўспрыманне пры гэтым будзе розным, бо выбар інфармацыі і метадаў залежыць ад узроставых асаблівасцей навучэнцаў.

У сваёй рабоце я выкарыстоўваю народную тэматыку: фальклор, паэзію, казкі, эпас, фразеалогію і лексіку роднай мовы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, абрады і традыцыі, г.зн. усе тыя духоўныя каштоўнасці, чым багата наша вялікая Радзіма, што складаюць стрыжань нацыянальнага характару для выхавання патрыятызму.

На факультатыўных занятках гучаць музычныя творы беларускіх кампазітараў, фрагменты духоўнай музыкі, вершы пра Беларусь, пра родны край, затым праца паглыбляецца і пашыраецца, навучэнцы сустракаюцца з народнымі майстрамі, заняткі праводзяцца ў займальнай гульнявой форме, у змест якіх уключаецца больш гістарычнага матэрыялу. Абавязкова навучэнцы знаёмяцца з традыцыямі, абрадамі, паданнямі сваёй мясцовасці, даведваюцца пра старажытныя гарады, пра свой родны горад, пра вёску, прымаюць удзел у розных святах і экскурсіях, сустракаюцца са знакамітымі



Репозиторий БрГУ

людзьмі свайго краю. На працягу навучальнага года ў школу былі запрошаны малодшы сын Якуба Коласа - Міхась Канстанцінавіч, працаўнікі музеяў, пісьменнікі - Таццяна Гарох, Таццяна Марцава, Святлана Мажароўская, Алена Мірчук і іншыя. Сумесна з майстрамі быў праведзены занятак, на якім школьнікі спрабавалі рабіць разнастайныя нацыянальныя вырабы з гліны і саломкі.

З першых школьных дзён фарміру ў дзяцей такія важныя паняцці, як "Радзіма", "патрыёт", "подзвіг". Абуджаючы ў навучэнцаў цікавасць да гісторыі, подзвігаў, складаю спісы кніг на ваенна-патрыятычную тэматыку для дадатковага чытання. Праводжу цыклы гутарак, прысвечаных сімволіцы краіны, прымаем удзел у ваенна-патрыятычных гульнях, аглядзе строя і песні, арганізоўваю ўрокі мужнасці, для ўдзелу ў якіх запрашаю воінаў-інтэрнацыяналістаў, ветэранаў-маракоў Дняпроўскай ваеннай флатыліі. Яны знаёмяць школьнікаў з пэўнымі яркімі фактамі гераічнасці воінаў, дзяцей-піянераў і школьнікаў. З навучэнцамі ў школе адрадзілі цімураўскую работу і пастаянна аказваем сталую дапамогу ветэранам вайны. Ва ўсіх мерапрыемствах, якія мною праводзіліся, судзейства ажыццяўляюць старшакласнікі, ветэраны і паважаныя госці. Такім чынам, адбываецца пераемнасць пакаленняў у ваенна-патрыятычнай дзейнасці школьнікаў.

Працуючы ў дадзеным накірунку, я заўважыла і з упэўненасцю магу казаць, што калі навучэнцы самі з'яўляюцца ўдзельнікамі творчага працэсу, тады яны з цікавасцю вывучаюць матэрыял. І ўсё гэта вельмі важна для фарміравання патрыётаў, годных грамадзян сваёй Айчыны.

Радзіма для дзяцей пачынаецца з сям'і [3, с.42], таму для фарміравання грамадзянскай пазіцыі і актыўнага ўцягвання ў жыццё школы бацькоў праводжу такія мерапрыемствы, як "Тыдзень Маці", дэкада сям'і, святы "Тата, мама я - спартыўная сям'я", круглы стол "Традыцыі маёй сям'і", "Радаслоўнае дрэва", якія спрыяюць развіццю пазнавальна-творчай цікавасці навучэнцаў і сумеснай работы сям'і і школы.

Патрыётамі не нараджаюцца, патрыётамі становяцца, у сваёй працы я прыкладаю ўсе сілы каб дапамагчы дзецям у гэтым. Як настаўнік-краязнаўца выступаю арганізатарам усталявання цеснай узаемасувязі адукацыйнай, пазакласнай і пазашкольнай працы, паміж факультатывамі і іншымі формамі працы па вывучэнні мясцовай гісторыі ў школе, а таксама міжпрадметных сувязяў на краязнаўчай аснове. Шляхі і метады вывучэння роднага краю разнастайныя. Іх выбар залежыць, першым чынам, ад узросту школьнікаў, ад узроўню іх падрыхтоўцы, ад мэт і задач заняткаў.

Для арганізацыі працы факультатыўных заняткаў выкарыстоўваю краязнаўчы матэрыял пры дапамозе самых распаўсюджаных метадаў: лекцыя настаўніка, гульня, выраб картасхем, складанне летапісу, урок-экскурсія і самастойная праца. Менавіта вывучэнне краязнаўчага матэрыялу (у сілу яго даступнасці для навучэнцаў) утрымоўвае вялікія магчымасці для самастойнай працы, а таксама для арганізацыі групавых даследаванняў, дыспутаў, дыскусій. Краязнаўства ставіць настаўніка і дзяцей у становішча даследчыкаў.



Рэпазіторый БрДУ

Добрай традыцыяй нашых дзён па зберажэнні багацця нацыянальнай культуры, фарміраванні любові да Айчыны, свайго народа стала штогадовае правядзенне ў верасні дэкады беларускай пісьменнасці, якая ўключае урок-вандраванне “Мая, твая, наша Радзіма”, урок мужнасці “Супрацоўніцтва школы з пагранічнай часткай № 1 г. Пінска”, вусны часопіс “Нашы славутыя продкі і землякі”, турнір знаўцаў “Краязнаўчы калейдаскоп”, гульню “Цудадзейнае кола беларускіх рамёстваў і промыслаў”, падарожжа “О, край родны, край прыгожы!” і інш.

На аснове краязнаўчага матэрыялу мною распрацаваны гульні, практычныя работы, экскурсіі, мультымедыйныя прэзентацыі, праекты, крыжаванкі, творчыя заданні, віктарыны, памяткі для настаўнікаў.

Пры выкарыстанні краязнаўства ў адукацыйным працэсе малодшых школьнікаў адсочваецца дынаміка развіцця ўзроўню засваення ведаў аб родным краі. Вучні прымаюць актыўны ўдзел у розных конкурсах па краязнаўстве, адзначаецца рост ахопленасці вучняў пачатковых класаў краязнаўчай дзейнасцю.

Практыка выкарыстання краязнаўства ў адукацыйным працэсе малодшых школьнікаў паказала павышаную матывацыю навучэнцаў да вучобы, якая забяспечвае фарміраванне пачуццяў патрыятызму і грамадзянскасці.

Усе мерапрыемствы, са слоў навучэнцаў, “дапамагаюць перанесціся ў далёкае мінулае, уявіць падзеі даўніх гадоў, нараджаюць разважанні пра гонар і абавязак перад Радзімай”.

Такім чынам, выкарыстанне сродкаў краязнаўства на факультатыўных занятках як аснова патрыятычнага выхавання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі дапамагае зрабіць сваю работу больш цікавай і блізкай дзецям, з’яўляецца першым парасткам нацыянальнай самасвядомасці, дае першыя ўрокі грамадзянскасці, спрыяе выхаванню сапраўдных патрыётаў.

Спіс выкарыстанных крыніц:

1. Акудовіч, Ц.В. Краязнаўчая дзейнасць у выхаванні моладзі // Ц.В..Акудовіч. Пазашкольнае выхаванне 2010. – № 8. – С.29- 37

2. Ліхачоў, Д.С. Зямля родная / Д.С. Ліхачоў. – М..: Пралеска 1983. –78 с.

3. Пракаповіч, І.М. І край родны адкрые таямніцы. Сістэма школьнага краязнаўства / І.М.Пракаповіч. - М.: Чатыры чвэрці 2006. – 124 с.:іл.

## THE SYSTEM OF PEDAGOGICAL BULLYING PREVENTATIVE MEASURES IN EDUCATIONAL ESTABLISHMENTS

***E.S. Tsedric***
Scientific adviser – A.E. Bogatyrova, master of pedagogy
*Orsha College VSU named after P.M. Masherov*

Functioning of educational establishments in information society has become more transparent and «clear». This situation revealed many problems which neither



Репозиторий БрГУ